Людзьмі звацца!
Янка Купала.

СПРАВА

№ 3
Сакавік
2012 г.

http://vk.com/id168308417

Выдаецца з лютага 2012 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ МАГІЛЁЎСКАГА РАЁНА

Як ёсць



Начальнік Упраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама генерал-маёр Ф.Ф.Балейка правёў прэс-канферэнцыю па выніках працы сваіх падначаленых за мінулы год. Было адзначана, што міліцыя працавала дзейсна. У прыватнасці, былі раскрыты ўсе 59 наўмысных забойстваў, чаго не было ўжо шмат гадоў. Пайшлі на спад грабяжы, разбоі, крадзяжы з крамаў. Дзякуючы барацьбе з п'янствам, на 3% зменшылася колькасць злачынстваў «па п'янай лавачцы», на 9,6% менш памерла грамадзян ад выпадковага атручвання алкаголем (274 чал.), больш за тысячу хранічных алкаголікаў адправіліся ў ЛТП. Трэба дадаць, што колькасць магілёўскіх "начных" гандлёвых крам скарацілася з 31 да 14.

Павялічваюцца крадзяжы металаў, ската з прыватных і калгасных падворкаў. Міліцыя канфіскавала больш за мільён тон метала, які незаконна везлі ў Расію. Застаюцца папулярнымі крадзяжы аўтамабіляў, асабліва ў Магілёве і Бабруйску.

Было ўзбуджана каля тысячы крымінальных спраў у эканамічнай сферы. Тут былі і "рэзанансныя" справы. Напрыклад, у Краснапольскім і Хоцімскім раёнах як бы для фермераў закупілі калійныя ўгнаецці па 15 долараў за тону і везлі ў Расію ўжо па 400 долараў. А ў Шклоўскім раёне першы намеснік старшыні райвыканкама даў указанне зрабіць перадаплату 100% на закупку крупнарагатага ската ў Сербіі (!) (хаця звычайная практыка 20% перадаплаты) - і 17 мільярдаў рублёў зніклі ў невядомым накірунку. Акрамя таго, у Бабруйскім раёне за атрыманне хабару ў памеры 4.000 долараў арыштавалі суддзю. За тое ж самае былі затрыманы выкладчыкі Горацкай акадэміі і Магілёўскага універсітэта харчавання.

Было адзначана, што дактыласкапія - добрая прафілактычная мера. І не за гарамі тыя часы, калі ў нашых пашпартах будуць электронныя чыпы з біяметрычнымі дадзенымі, якія ўжо даўно дзейнічаюць у краінах з павышанай тэрарыстычнай актыўнасцю.

Генерал паведаміў, што самая пільная ўвага надаецца супрацоўнікам міліцыі, якія самім фактам службы ў органах прызваныя быць прыкладам для нашых грамадзян. Але гэта далёка не заўсёды так. За мінулы год у адносінах да супрацоўнікаў міліцыі было ўзбуджана пяць крымінальных спраў, два міліцыянеры асуджаныя. Бываюць і парушэнні дысцыпліны. Тут асаблівы ўпор робіцца на прафілактыку, але калі супрацоўнік не паддаецца выхаванню нават пасля аб'яўленага спагнання - ён звальняецца са службы.

Алесь СУВОРАЎ.

Фотаздымак "Веснік Магілёва".

І нават з такіх кабінетаў зыходзяць...

Так склалася, што праца ў райвыканкамаўскіх кабінетах лічыцца вельмі прэстыжнай - усё-ткі дзяржслужба, а гэта ў перспектыве, ў тым ліку, і неблагая пенсія. І мала хто з трапіўшых у наменклатурную "абойму" дабраахвотна жадае памяняць "цёплае" месца на нешта іншае. Але ж вось тут бываюць і выключэнні. Літаральна днямі старшыня аблвыканкама П.Руднік уручыў дыплом лаўрэата рэспубліканскага конкурсу "Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь" Андрэю Мікалаевічу Седукову - дырэктару прадпрыемства "Газасілікат", якое месціцца ў Магілёўскім раёне. І трэба адзначыць, што А.М.Седукоў працаваў даволі працяглы час начальнікам аддзела эканомікі Магілёўскага райвыканкама і на гэтай пасадзе вызначаўся ўдумлівымі адносінамі не толькі да ўсіх акалічнасцяў эканомікі раёна,





Сустрэча ў Брылях. 2008 г.

але і жыцця наогул. Вельмі любіў выязджаць у самыя аддаленыя вёскі, каб сустрэцца з людзьмі, паслухаць іх, паглядзець ім у вочы. І неяк не затрымаўся ён на гэтай утульнай пасадзе - зышоў туды, дзе рэальная справа, якую можна памацаць рукамі і ўбачыць вынікі сваёй дзейнасці. І вынікі гэтыя досыць добрыя - рэспубліканскі дыплом з рук губернатара таму сведчанне.

Антон ДУБАЛОМАЎ.

Да 130-годдзя Янкі КУПАЛЫ



На сход!

На сход, на ўсенародны, грозны,
бурны сход
Ідзі, аграблены, закованы народ!

Як роўны йдзі жыхар між роўных жыхароў
Аддай на суд свае ўсе крыўды, сьлёзы, кроў.

Аб вечным катаваньні, зьдзеку далажы
І пакажы на курганы і на крыжы.

І аб раскопаных магілах не забудзь,
Дзе груганы тваіх там продкаў косьці рвуць.

Як гналі пот зь цябе паны і каралі,
Як гналі проч цары з радзімае зямлі.

І як крываўляць раскаваныя рабы,
Як ты ўпадаеш зь непасільнай барацьбы.

Як Бацькаўшчыну тваю рэжуць на кускі.
Як гібнеш зь дзецьмі ты ад катняе рукі –

Аддаці ўсё на суд, на ўсенародны сход
Ідзі, аграблены, закованы народ!

1918 г.

Беларусь - наперадзе!

Гаскамстат Украіны падлічыў, як змяніліся спажывецкія цэны ў краінах СНД за 2011 год. Лідэрам па росту цэн аказалася Беларусь. Так, там са студзеня 2011 г. да студзеня 2012 г. цэны ўзраслі больш, чым удвая - на 109,7%. У астатніх краінах рост быў невялікім. Так, спажывецкія тавары ў Украіне за год падаражэлі на 3,7%, у Азэрбайджане і Арменіі - на 4,8%, у Казахстане - на 5,9%, у Кіргізіі - на 3,8%, у Малдове - на 7%, у Расіі - на 4,2%, у Таджыкістане - на 7,7%. Дадзеных па Узбекістану не прыводзіцца. *www.segodnia.ua*

Василий ЛЕОНОВ: "В стране не рынок и не социализм!"



Поводом к разговору с бывшим Министром сельского хозяйства Беларуси Василием Севастьяновичем Леоновым послужил тот факт, что ветеринарная и фитосанитарная служба Украины с 1 марта 2012 года приостановила ввоз на территорию Украины молока и молочных продуктов из Республики Беларусь. Официальная причина запрета - существенное превышение остатков ветеринарных препаратов, вводимых тамошним коровам. Речь, в основном, об антибиотиках в белорусском молоке, сухом молоке, сыре и других продуктах. Украинская сторона утверждает, что Беларусь систематически поставляет загрязнённую продукцию, несмотря на неоднократные предупреждения.

-- Господин Леонов, Вы белорусское сельское хозяйство знаете не понаслышке. Что же происходит в некогда весьма успешной отрасли республики?

-- Если говорить откровенно, то сельское хозяйство страны скоро с потрохами сдадут россиянам. Говорю это осознанно, видя подход к этой важнейшей отрасли хозяйствования здесь и там.

- Вы хотите сказать, что сельхозпроизводство Беларуси, в которое закачиваются триллионы белорусских рублей, не выдержит конкуренции даже с Россией?

-- Наверняка не выдержит! Скоро мы к этому подойдем и почувствуем на себе. Пока что и мясо, и молоко у нас не дороже российских продуктов, но это явление временное. Еще в этой пятилетке вслед за «Белтрансгазом» и другими лик-

В чём секрет долголетия?

(Заканчэнне. Пачатак у № 2)

«...Своим умением полностью отдавать себя работе, проявлять творческую инициативу коллектив славился на весь район».

Зинаида Леоновна не раз давала открытые уроки для представителей отдела образования. Однажды



С мужем Алексеем Аверьяновичем Ермаковым и дочерьми Татьяной и Тамарой

пришлось давать открытый урок, а параллельно вести замену в другом классе. Пришлось как-то и четыре подряд открытых урока давать.... Но Зинаида Леоновна всегда справлялась на «пять с плюсом».

Из воспоминаний Зинаиды Голубцовой:

«Лето 1945 года. Во дворе залаяла собака. Подумалось: «Кто это так поздно?» А это Якуб Кириллович вернулся с войны!.. По дороге домой он заехал в Минск, чтобы оформить документы в институт. А потом мы вместе прожили семь лет, но судьба распорядилась по-своему - и нам пришлось расстаться...»

Теперь он – преподаватель Могилёвского государственного педагогического института , а она, молодая и красивая учительница, продолжала работать в Голеневской средней школе.

А вскоре после этого открылась новая, очень важная страница жизни. Сорок семь лет (с 1950 по 1987 годы), «как один миг» прожили душа в душу Зинаида Леоновна Голубцова и Алексей Аверьянович Ермаков. Педагоги повстречались в деревне Щежерь, где он преподавал математику. А в 1953 году его перевели в Голеневскую среднюю школу, где он и проработал до её закрытия.

Кроме старшей дочери Марии, они воспитали еще двух прекрасных дочерей – Тамару и Татьяну.

...Сегодня, вновь и вновь перелистывая старый семейный фотоальбом, удивляешься жизнерадостности этой маленькой замечательной женщины, обладающей



Былое и думы...

неиссякаемой энергией, оптимизмом и удивительной мудростью... Не в этом ли и состоит секрет её долголетия?

Лариса ПЕТРУСЁВА,
учитель Кадинской СШ.

У назвах вуліц застануцца...

Здаецца зусім нядаўна характэрную нетаропка-велічную пстаць Якуба Усікава можна было сустрэць і ў шумным Магілёве, і ў родным Кадзіне, але на карце Магілёва сёння ўжо з'явілася вуліца, названая ягоным імем. Магілёўскі гарадскі Савет дэпутатаў зацвердзіў і шэраг іншых назваў новых вуліц, дзе навечна застануцца імёны вядомых магілёўскіх пісьменнікаў Янкі Журбы, Платона Галавача, Васіля Шашалевіча, Васіля Каваля, Анатоля Сербантовіча, Мікаля Лук'янава, Аркадзя Кандрусевіча, Пятра Шасцерыкова, Васіля Матэвушава, Васіля Карпечанкі і Эдуарда Валасевіча. Таксама адну з найбуйнейшых вуліц назвалі ў гонар Мікалая Судзілоўскага - ураджэнца Магілёва, філосафа, вучонага і рэвалюцыянера, Прэзідэнта Сената Гавайскіх астраноў.



Новыя вуліцы паўстануць у раёне вёсцы Гарадшчына, паміж Казіміраўкай, Цішоўкамі і Ямніцкім пасёлкам.

Называць магілёўскія вуліцы імёнамі вядомых землякоў -- вельмі добрая практыка. Гэта ўсё-ткі цікавей, чым 12 завулкаў Лізы Чайкінай, 10 Падгорных, 7 Вясенніх ці "Клубный овраг", "Рыночный тупик" ды нейкі "Республиканский спуск".

Сяргей ПІСЬМЕННЫ.

Василий ЛЕОНОВ: "В стране не рынок и не социализм!"

(*Заканчэнне. Пачатак на с.1*)

видными производствами, включая «Беларуськалий» и железную дорогу, будет потеряна и сельскохозяйственная отрасль.

-- Полагаете, что земля перестанет родить?

-- Дело не в земле, а в том, что к ней надо приложить и труд, и мозги, и деньги, только тогда будет отдача. К слову сказать, после войны урожайность в БССР была семь центнеров зерна с гектара. Белорусские большевики подняли ее до 25-ти. Это произошло в результате и грамотного применения удобрений, и мелиорации и всех остальных технологий

- То есть, по-Вашему, мы сейчас проедаем то, что вложили в село коммунисты?

-- И делаем это с большим успехом, несмотря на огромные вложения в отрасль. Выше я говорил о том, что кроме труда и денег в этом деле нужны еще и мозги.

- Сейчас начались проблемы с поставкой молока в соседнюю Украину. Продукт не проходит по качеству. Говорят о завышенном количестве в нем антибиотиков. Как это понять?

- В первую очередь следует посмотреть на корма. Сейчас стало модным, чтобы привесы и надои росли, применять всякие биодобавки и прочую химию. Коровы ведь часто болеют, их лечат, делают уколы и все это идет в молоко. Его по технологии следует в дальнейшее производство не пускать, но кто ж так у нас делает? И еще, поинтересуйтесь, какова бактериальная обсемененность молока, то есть уровень соблюдения гигиены при дойке, транспортировке, хранении. Тут полный мрак - грязь, коровьи, извините, испражнения и прочие не улучшающие качества продукта ингредиенты.

СПРАВКА. Для потребителя молоко является качественным, если оно не только имеет высокую пищевую ценность, но и безопасно, то есть не содержит ни опасных бактерий, ни антибактериальных препаратов. Основными показателями, характеризующими качество молока, являются: содержание жира, бактериальная обсемененность; содержание белка, содержание соматических клеток, наличие ингибиторов, точка замерзания, алкогольная проба, термоустойчивость. Бактериальная обсемененность - это количество микроорганизмов в 1 см3 молока. В молоке могут содержаться бактерии, дрожжи и плесневые грибки. Они попадают в молоко при доении из внешней среды. Повышенная бактериальная обсемененность - результат несоблюдения правил гигиены при производстве молока и его хранении. По европейским стандартам показатель бактериальной обсемененности в сыром продукте не должен превышать 100 тыс. в 1 см3. В РБ - в три раза выше, но и эта норма часто не соблюдается. Высокая бактериальная загрязненность приводит к ухудшению вкуса, снижению питательной ценности сырого молока и изготавливаемых из него продуктов, а также способствует значительному сокращению их срока хранения.

-- Вот тебе и лозунг: «Покупайте белорусское!»...

- Скажу вам так: чтобы понять какое качество молока в стране, надо попробовать сыр. Это лакмусовая бумажка качества, тут все проявляется. Даже литовский сыр ныне лучше нашего. А это говорит о качестве исходного материала, то есть молока. Вот украинцы и не хотят брать плохой товар.

-- Так что же со всем этим делать?

-- Главное - отправить на пенсию Лукашенко, выбрать нового президента и, наконец-то, определиться, чем заниматься: то ли рынком, то ли социализмом?

СПРАВКА. Василий Севастьянович Леонов родился в 1938 г. в деревне Дубинец Костюковичского района Могилевской области

Окончил Белорусский институт механизации сельского хозяйства. Работал инженером в колхозе. Избирался на партийные должности. Был первым секретарём Могилевского обкома КПБ в 1984-1991 гг. В этой должности дал согласие на назначение А.Лукашенко директором совхоза «Городец». Поддержал А.Лука-шенко, когда тот выдвинулся кандидатом в народные депутаты СССР в альтернативу председателю Госплана БССР Вячеславу Кебичу и проиграл. Когда после выборов районные власти начали "давить" директора совхоза, В.Леонов не просто остановил их - он лично приехал в контору совхоза «Городец» и в присутствии посторонних извинился перед А.Лукашенко.

23 августа 1994 г. был назначен Министром сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь. 11 ноября 1997 г. задержан в собственном кабинете и помещен под стражу. А.Лукашенко обвинил его в ряде уголовных преступлений, в том числе и в причастности к убийству начальника Службы контроля президента по Могилевской области Е. Миколуцкого. Был осуждён, находился в заключении и считается одним из первых белорусских политических заключённых.

Падрыхтаваў Міхась БАРАЗНА.
Паводле http://govorim.by/



"УСЯКАЯ ЎЛАДА ІДЗЕ АД НАРОДА. І НІКОЛІ ЎЖО ДА ЯГО НЕ ВЯРТАЕЦЦА". Габрыель Лауб.

"СПРАВА"
Инфармацыйна-грамадскі бюлетэнь Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці, Рэспубліка Беларусь.
Выданне здзяйсняецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб сродках масавай інфармацыі".

Адказны за выпуск - Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі, вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: bryli@mail.ru

Матэрыялы друкуюцца на мове аўтараў.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Звярстана і надрукавана на ўласным абсталяванні.
Падрыхтавана да друку 15.03.2012. 21.00.
Наклад 299 асобнікаў. Распаўсюджваецца бясплатна.